ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

MCMXL

№ 6 (434)

15 ліпеня 2014 года

Выдаецца з 1986 года. Выходзіць адзін раз на месяц. Распаўсюджваецца бясплатна

# ПА КАЗАЧНЫХ СЦЯЖЫНКАХ



**Знаёмства з турыстычнымі і этнакультурнымі аб'ектамі Гродзеншчыны і Сувальскага павету адбылося ў час прэс-туру польскіх і беларускіх журналістаў у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Вандроўка ў этнаказку".**

*Як даўно спрабаваў ты, паважаны чытач, успомніць светлае і ціхамірнае дзяцінства? Забыцца на некаторы час пра сур'ёзнасць і статус і адправіцца, напрыклад, на пошукі маленькіх гномаў – красналюдкаў? Ці, можа, прайсціся шляхам старажытных ваяроў-яцвягаў і самастойна стойка пераадолець усе перашкоды, ці на ўласныя вочы ўбачыць, як ажываюць галоўныя героі казак і паданняў, ці рушыць у прыгодніцкую вандроўку, каб даведацца пра флору і фаўну Бацькаўшчыны? А як табе прапанова пасябраваць з сівенькім паганскім богам удачы і шчасця Белуном – славянскім апекуном заблудных падарожнікаў? А можа ты б хацеў больш дазнацца пра этнакультурную спадчыну сваіх продкаў? Захапляльнае і незабыўнае правядзенне вольнага часу гарантуюць распрацоўшчыкі турыстычных маршрутаў "Казачны шлях" на Сувальшчыне і "Гасцінцамі Белуна" на Гродзеншчыне, якія сталі магчымыя дзякуючы рэалізацыі праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Вандроўка ў этнаказку".*

***(Заканчэнне на 2-й стар.).***

**НА ЗДЫМКУ: старадаўнімі народнымі беларускімі песнямі гасцей вітаюць супрацоўнікі Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея.**

# В ЗДОРОВОМ ТЕЛЕ – ЗДОРОВЫЙ... УМ

**Пожалуй, столь интенсивного обновления отечественная медицина не переживала давно: миллионные средства направляются на капитальное строительство, модернизацию, укрепление материальной базы учреждений здравоохранения, параллельно развиваются новые направления клинических исследований, система компьютеризации, методы диагностики, на помощь специалистам приходят современные технологии и оборудование. Ведь приоритетной задачей любого социально ориентированного государства является забота о человеке, а тем более о благополучии молодого поколения – интеллектуального, духовного и трудового потенциала республики.**



Проведение профилактических мероприятий и сохранение здоровья молодежи своей основной задачей считает и коллектив Центра медицинской помощи и социального развития ГрГУ. Сегодня здесь можно получить весь спектр необходимых медицинских услуг – от диагностики до реабилитации.

**НА СНИМКЕ: начальник Центра медицинской помощи и социального развития кандидат медицинских наук Оксана Котова презентует современную кардиосистему.**

***(Окончание материала на 4-й стр.).***

**3 ЧЭРВЕНЯ 2014 года споўнілася 89 гадоў Івану Міхайлавічу СЦЯПУРУ *(на здымку)*, дацэнту кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі.**



Нялёгка пачыналася яго працоўнае жыццё. Заканчэнне васьмігадовай школы супала з пачаткам страшэннай вайны: у ліпені 1944 года 19-гадовы юнак уступіў у рады Савецкай Арміі. У складзе 17-й асобнай штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады 1-га Беларускага фронта Іван Міхайлавіч удзельнічаў у ваенных аперацыях на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Польшчы, Германіі. Асабліва цяжкія баі прыйшлося вытрымаць на Кюстрынскім плацдарме за Одэрам. 16 красавіка 1945 года, у першы дзень Берлінскай аперацыі, ён быў паранены.

Калі вайна скончылася, служыў у Германіі. У Берліне паступіў у вячэрнюю сярэднюю школу пры Палітупраўленні Савецкай ваеннай адміністрацыі, а пасля яе заканчэння ў 1948 годзе – на першы курс завочнага аддзялення фізіка-матэматычнага факультэта Баранавіцкага настаўніцкага інстытута.

# АД УДЗЯЧНЫХ КАЛЕГ

З дыпломам настаўніка І.М. Сцяпура чатыры гады працаваў выкладчыкам матэматыкі ў вясковай школе ў Брэсцкай вобласці. У 1952 годзе паступіў на завочнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Гродзенскага педінстытута, які скончыў з выдатнымі адзнакамі.

Са жніўня 1954 года да выхаду на пенсію Іван Міхайлавіч працаваў у нашым універсітэце. У 1971-м ён абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Маскоўскім абласным педінстытуце. Выконваў абавязкі загадчыка кафедры элементарнай матэматыкі, 9 гадоў працаваў намеснікам дэкана матэматычнага факультэта.

Іван Міхайлавіч рабіў і працягвае рабіць вялікі ўплыў на развіццё матэматычнай адукацыі ў рэгіёне. У пачатку 60-х гадоў яму было даручана кіраўніцтва першай у вобласці школай юных матэматыкаў, якая стала прамаці вядомага ў рэспубліцы матэматычнага ліцэя "Альфа". Многія гады чытаў лекцыі па актуальных праблемах методыкі выкладання матэматыкі для настаўнікаў Гродзеншчыны, удзельнічаў у іх перападрыхтоўцы. Паралельна выкладаў у класах з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні матэматычных алімпіяд школьнікаў. Апублікаваў шэраг артыкулаў для вучняў у навукова-папулярным часопісе "Альфа".

Асаблівую ўвагу І.М. Сцяпура ўдзяляў выхаванню моладзі ў духе патрыятызму, павагі да працы і следавання высокім маральным прынцыпам. На працягу шэрага гадоў ініцыятыўна працаваў куратарам студэнцкіх груп, старшынёй камісіі па рабоце са стажорамі матэматычнага факультэта.

Навучальна-выхаваўчая, навукова-метадычная і грамадская праца Івана Міхайлавіча вызначалася высокай якасцю. У розны час І.М. Сцяпура атрымаў высокія дзяржаўныя ўзнагароды – ордэн Айчыннай вайны першай ступені, медалі "За адвагу", "За перамогу над Германіяй" і трынаццаць іншых. Сярод апошніх – два працоўныя медалі: "За доблесную працу" і "Ветэран працы". Ён мае нагрудны знак "Выдатнік народнай асветы", "Ударнік дзясятай пяцігодкі" і іншыя, быў узнагароджаны пяццю Ганаровымі граматамі Міністэрства асветы, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Кваліфікаваная праца, педагагічным талентам і высокімі асабістымі якасцямі Іван Міхайлавіч заваяваў аўтарытэт у калег і вучняў. Яго вылучаюць добрасумленнасць і прынцыповасць, адказнасць і вялікая патрабавальнасць да сябе, добразычлівыя адносіны да тых, хто побач. У светлае свята 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў жадаем дарагому калегу добрага здароўя і далейшых поспехаў на карысць Радзіме!

**Калектыў кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі.**

ЖУРНАЛІСТ ІДЗЕ Ў СВЕТ

# ПА КАЗАЧНЫХ СЦЯЖЫНКАХ


Беларускія і польскія журналісты – першапраходцы турыстычных маршрутаў, створаных у рамках праекта "Вандроўка ў этноказку".

### СУВАЛЬШЧЫНА – КРАЙ ЯК КАЗКА

Менавіта такі слоган будзе суправаджаць вандроўніку на працягу ўсяго падарожжа па гэтым прыгожым, незвычайна маляўнічым кутку Польшчы. Сама матухна-прырода паклапацілася пра тое, каб адсутнасць буйных прадпрыемстваў – апоры эканамічнай стабільнасці і незалежнасці – кампенсавалася наяўнасцю такіх нерукатворных жамчужын, як Аўгустоўскі канал, нацыянальныя прыродныя паркі, бяздонныя блакітныя азёры, казачныя краявіды. Таму і стаўку тут робяць выключна на турызм.

– Штогод на Сувальшчыну прыязджае каля 300 тысяч гасцей, – распавядае дырэктар Сувалкскай агратурыстычнай палаты Эльжбета Нядзейка. – Каб задаволіць іх патрэбы, мы актыўна развіваем сектар абслугоўвання: прадуктыўна працуюць аграсядзібы, адкрываюцца новыя атэлі і кавярні. Дзякуючы фінансавай падтрымцы Еўрасаюза, на турыстычнай карце пачалі з'яўляцца новыя кропкі, за якімі – прыродныя і гісторыка-культурныя набыткі рэгіёну.

У рамках праекта "Вандроўка ў этноказку" акцэнт быў зроблены на папулярызацыю актыўнага, экалагічнага, краязнаўчага адпачынку сем'яў з дзецьмі і моладзі.

Не выпадкова была выбрана і назва маршруту – "Казачны шлях". Натхняльная Сувальшчына з'яўляецца радзімай польскай дзіцячай пісьменніцы Марыі Канапніцкай. Менавіта з-пад яе пяра выйшлі сусветнавядомыя гісторыі пра сіротку Марысю і добрых гномаў. Маленькія красналюдкі разышліся па так званых "Вёсках казак", але пабачыцца з імі не проста – спатканне трэба заслужыць. Праўда, два малюткі засталіся і да гэтай пары пільна ахоўваюць уваход у музей, прысвечаны жыццю і творчасці вядомай казачніцы.


Той самы казачны вартаўнік.

Сюжэты і героі твораў Марыі Канапніцкай, а таксама мясцовыя легенды сталі галоўнай "фішкай" маршруту, які аб'яднаў сем казачных аб'ектаў па ўсім Сувалкскім рэгіёне. Тут пабудаваны вёскі вясёлых падарожнікаў, двух майстроў, дароў лесу, гномаў-красналюдкаў, сакрэтных вулачак, забытых воінаў і прыгод, створана адпаведная інфраструктура, распрацаваны сімволіка, маршрутызатары, падрыхтаваны інфармацыйныя матэрыялы.

Вандроўка па вёсках нагадвае захапляючы квест, галаваломку, якія суправаджаюцца рухавымі конкурсамі і інтэрактыўнымі гульнямі, анімацыйнымі і адукацыйнымі праграмамі, гістарычнымі рэканструкцыямі, батлеечнымі спектаклямі. Кожны маленькі турыст на пачатку свайго падарожжа атрымлівае "Пашпарт вандроўніка" і схему маршрута. Рухаючыся наперад, ад аднаго аб'екта да другога, дзятва збірае адмысловыя пячаткі, каб потым атрымаць галоўную ўзнагароду. Гэта можа быць чырвоная шапачка красналюдка, маленькія домікі з постацямі герояў Марыі Канапніцкай ці яркія ілюстраваныя кніжкі.

Пакуль малыя шукаюць гномаў ці іншых казачных персон, дарослым таксама прапаноўваецца не марнаваць час. Для іх паслуг – пракат веласіпедаў і сплавы на байдарках, тэнісныя корты і заняткі фітнесам, прагулкі па Аўгустоўскай пушчы ці незабыўных азёрах.

Усе, хто жадае, могуць адправіцца ў падарожжа па вузкакалейнай чыгунцы. Пабудаваная больш за сто гадоў таму, яна прызначалася для перавозкі драўніны. Але сёння не прастойвае, чакаючы канчатковага заняпаду і разбурэння, а карыстаецца вялікім попытам у турыстаў: з адкрытых вагонаў вельмі зручна і цікава назіраць за жыццём запаведнага Вігерскага нацыянальнага парку – цягнік абавязкова спыніцца ў найпрыгажэйшых мясцінках.

Дарэчы, у "Вёсках казак" ужо пабывалі школьнікі з Ваўкавыску.


Вігерская вузкакалейка прапануе турыстам вандроўку па запаведным лесе.

Пералічваць цуды казачнага краю можна бясконца, але не меньш цікавым абяцае быць працяг "Падарожжа ў этноказку" на беларускім баку.

### ГРОДЗЕНШЧЫНА: ЭТНАГРАФІЧНАЯ СКАРБОНКА БЕЛАРУСІ

На нашай гродзенскай зямлі падарожніку прапануюць прайсці "Гасцінцамі Белуна". Чаму менавіта гэты язычаскі бог стаў сімвалам праекта? Справа ў тым, што з'яўляючыся ў выглядзе старца з доўгай белай барадой, у белым адзенні, з кіем у руцэ, ён быў для продкаў увасабленнем шчаслівага выпадку. Так, днём сівенькі Бялун паказваў дарогу заблудным падарожнікам, ці хаваўся ў час жніва ў полі, каб потым узнагародзіць якога-небудзь бедняка багатымі падарункамі. "Цёмна ў лесе без Белуна", – гаварылі тагачасныя беларусы. Але сёння ён асвятляе шлях і сучасным падарожнікам і першапраходцам.

Галоўным партнёрам праекта на Беларусі выступіў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Як расказаў куратар праграмы кандыдат гістарычных навук Віталь Карнялюк, удзел у гэтым праекце ўжо даў свае выдатныя вынікі. Так, ва ўніверсітэце створаны вучэбны сектар этнічнага турызму, які прызваны палепшыць навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ, удасканалена інфраструктура музея Яўхіма Карскага ў гродзенскай гімназіі, што носіць імя знакамітага земляка, наладжана сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў у галіне этнічнага турызму, створаны новыя анімацыйныя праграмы і турыстычныя маршруты, у хуткім часе пабачыць свет адмысловы даведнік "Этнатурыстычныя і прыродныя рэсурсы Гродзенскага і Сувалкскага рэгіёнаў".

Але, бадай, самым важным дасягненнем праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва можна лічыць рэканструкцыю ўнікальнага Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музея. Створаны ў 1968 годзе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Алесем Белакозам, сёння ён носіць статус дзяржаўнага. Наведвальнік знойдзе тут найбагацейшую літаратуразнаўчую спадчыну, самабытны этнаграфічны аддзел, прадстаўлены аўтэнтычнай беларускай хаткай канца XVIII-пачатку XIX стагоддзяў, дзе экспануюцца побытавыя прадметы, посуд, прылады працы нашых прашчураў.

**ДА ВЕДАМА.**
Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Павышэнне прыцягальнасці трансгранічнага рэгіёна шляхам уключэння этнакультурных рэсурсаў у турыстычную дзейнасць (акронім "Вандроўка ў этноказку")" па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва Польшча-Беларусь-Украіна на 2007-2013 гады. Яго партнёрамі сталі Сувалкская агратурыстычная палата, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей і гродзенская гімназія № 1 імя акадэміка Я. Карскага. Агульны бюджэт праекта склаў больш за 1,2 мільёны еўра.


Майстар-клас па ткацтве ў Гудзевіцкім музеі.

Каля 16 тысяч экспанатаў налічваюць музейныя фонды. Але не толькі гэтымі каштоўнасцямі славіцца Гудзевіцкі музей. У 2011 годзе спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА папоўніла адмысловая тэхналогія падвойнага ткацтва, якую захоўвае тут 80-гадовая Вера Белакоз. Сёння паспрабаваць свае сілы ў ткацтве можа кожны жадаючы. Не атрымаецца на вялікіх кроснах, як у Веры Ігнацьеўны, – не бяда! Навічкі могуць паспрабаваць свае сілы і на малых, навучыўшыся ткаць паясы і закладкі для кніг.

– За два гады працы па захаванні і аднаўленні музея выканана нямала. Сёння неабходна толькі аформіць наяўныя экспазіцыі ў адрамантаваных залах, для чаго патрэбна адпаведная мэбля. Музей, які валодае найбагацейшай у Гродзенскай вобласці этнаграфічнай і краязнаўчай калекцыяй, можна сказаць, цалкам абнавіўся і можа прымаць турыстаў не толькі з Гродзенскага рэгіёну і Беларусі, але і з-за мяжы, – упэўнены Віталь Карнялюк.

У рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі былі таксама выдадзены інфармацыйныя буклеты пра музей, выпушчана сувенірная прадукцыя пад брэндам "Вандроўка ў этноказку", распрацаваны мясцовыя турыстычныя маршруты "Сотні гадоў разам: слядамі яўрэйскай культуры", "Цуд народнай творчасці", "Шляхам драўлянага дойлідства" і іншыя. Акрамя таго, музей разам з Мастоўскім домам народнай творчасці прапануе тры анімацыйныя праграмы, падчас якіх турысты знаёмяцца з вясковым побытам, гісторыяй вёскі, народнымі гульнямі, удзельнічаюць у майстар-класах па рамёствах, стральбе з лука, пляценні вянкоў, самастойна малююць герб. Анімацыя, безумоўна, можа мяняцца ў залежнасці ад мэтавай аўдыторыі. Тым турыстам, якія актыўна ўдзельнічалі ў праграме, на памяць выдаюцца спецыяльныя сертыфікаты.

– Сёння музей гатовы абслугоўваць да ста турыстаў у дзень. Упэўнена – ён стане для іх прывабным аб'ектам. Тым больш, што музей плануе актыўна пазіцыянаваць сябе на рынку турыстычных паслуг. Таму мы спадзяемся на актыўнае супрацоўніцтва з тураператарамі не толькі з Беларусі, але і Літвы, Польшчы, – падзялілася планамі дырэктар Гудзевіцкага музея Кацярына Басінская.

Яшчэ адзін аб'ект "Гасцінцаў Белуна" – гімназія № 1 імя акадэміка Я. Карскага. Менавіта тут знаходзіцца адзіны на ўсёй постсавецкай прасторы музей, прысвечаны выбітнаму філолагу і этнографу, аўтару фундаментальнай працы "Беларусы". За сродкі праекта ў навучальнай установе створаны і абсталяваны інфармацыйна-выставачная зала і канферэнц-зала. Вучні і настаўнікі гімназіі атрымалі магчымасць праводзіць тут выставы, віртуальныя экскурсіі. Такім чынам, спроба даказаць, што школьны музей можа быць паўнавартасным турыстычным аб'ектам, увянчалася поспехам.

Акрамя гэтых асноўных кропак на карце вандроўніка, гасцінная Гродзеншчына прапануе наведванне Лідскага раённага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры, супрацоўнікі якога ўяўляюць прыклад самаадданай любові да роднага краю і яго багатай культурнай спадчыны. Яны навучаць валіць воўну і распісваць яйкі, плясці з саломы і з лёгкасцю ўпраўляцца з кроснамі. Яны заспяваюць вам песні, мілагучныя і пранікнёныя, пакажуць спектакль у батлейцы і спрадвечныя танцавальныя па. І ўсё для таго, каб гасцяванне ў нас запомнілася надоўга, каб ва ўтульную і цёплую Беларусь захацелася вярнуцца яшчэ.

Прыцягальным аб'ектам для турыстаў ужо колькі гадоў з'яўляецца музей рок-музыканта Чэслава Немена ў Старых Васілішках. Створаны энтузіястамі, сёння ён прымае каля 2,5 тысяч наведвальнікаў у год. "Былі госці з Ізраілю, Швецыі, Францыі, Англіі, Амерыкі, Расіі, Украіны, Казахстана, Арменіі, Германіі… Бадай, не было толькі з Індыі", – пералічыў загадчык музея Уладзімір Сенюта.

А па дарозе ці можна не ацаніць непарушную прыгажосць рэспубліканскага ландшафтнага заказніка "Азёры"? Ці застацца абыякавым да таленту майстра-музыкі Мар'яна Скрамблевіча з Адэльску, які не толькі самастойна робіць дуды і дудкі, акарыны і жалейкі, але і віртуозна грае на іх.


Апякун падарожнікаў Бялун.

Такім чынам, прайшоўшы па ўсіх адметных кропках "Казачнага шляху" і "Гасцінцаў Белуна", можна з упэўненасцю сказаць, што прапанаваць турысту, нават самаму пераборліваму, можна нямала. Галоўнае – як. У гэтым пытанні беларусам будуць карысны напрацоўкі польскага боку – наша заходняя суседка мае вялікі вопыт у турыстычнай і праектнай дзейнасці. Таму, зрабіўшы стаўку на актыўную анімацыю ў праекце "Вандроўка ў этноказку", партнёры не пралічыліся. Падарожжа будзе запамінальным і захапляльным, калі яго ўдзельнікі самі стануць галоўнымі дзеючымі асобамі. Выдатныя спробы адыйсці ад вопыту экскурсаводаў робім і мы (яркі прыклад таму Гудзевічы і Ліда).

Галоўнае цяпер – зрабіць гэты выпеставаны і "абкачаны" журналістамі турыстычны прадукт даступным для жыхароў трансгранічнага рэгіёну. І тут зладжаны алгарытм сумесных дзеянняў павінны прадэманстраваць турыстычныя фірмы, фірмы-перавозчыкі. Так, напрыклад, праектам ужо зацікавілася гродзенская кампанія "Інтакс", якая з канца чэрвеня адкрыла новы аўтобусны маршрут Гродна-Друскенікі-Сувалкі.

Безумоўна, галоўнай праблемай застаецца наяўнасць візавага пытання. Але, хочацца спадзявацца, што з цягам часу і гэта не будзе перашкодай для незабыўных пазітыўных вандровак па самабытных Сувальшчыне і Гродзеншчыне.

**Іна ДАБРЫДЗЕНЬ.**
**Фота аўтара.**


На Аўгустоўскім канале ў Польшчы створана ўся патрэбная турыстычная інфраструктура.


Зрабіць цёплы і экалагічны капялюш з воўны турыстам дапамогуць у Лідскім цэнтры рамёстваў.

ПРИЗВАНИЕ БЫТЬ ПЕДАГОГОМ

# В.А. Максимович об успехах, планах и поворотах судьбы



**Выдающийся советский педагог-новатор В.А. Сухомлинский говорил: «Спорт становится средством воспитания тогда, когда он – любимое занятие каждого». Вячеслав Александрович Максимович добился немалых побед на борцовском ковре и по воле судьбы снискал успех в преподавательской и тренерской деятельности. Он смог сделать спорт средством воспитания: благодаря Вячеславу Александровичу открылись такие звезды греко-римской борьбы, как Виктор Уминский, Анатолий Федоренко, Александр Шестаков, Александр Павлов, Валерий Гридюшко, Иван Чечко, Иван Черныш. Заслуженный тренер СССР и БССР, судья всесоюзной категории, главный тренер сборной Республики Беларусь (1999-2000 гг.), главный тренер команды Гродненской области с 1968 года, заведующий кафедрой физического воспитания и спорта ГрГУ имени Янки Купалы, кандидат педагогических наук, профессор Вячеслав Александрович Максимович прошел тернистый путь от спортивного Олимпа к педагогике и тренерской деятельности.**

## О СПОРТЕ, ПРЕПОДАВАНИИ И ТРЕНЕРСТВЕ

Видно, у каждого из нас генетически заложены какие-то особенности. Когда человек нашел свой дар, принципиально важно развивать его.

С детства я чувствовал в себе призвание к педагогической деятельности и к физическому совершенствованию. Всегда хотелось максимально раскрыть свои возможности.



Что касается спорта, спорта высших достижений, то здесь не в полной мере удалось реализоваться. Было огромнейшее желание достичь больших успехов. Так сложилась судьба, что занялся спортивной борьбой, которая в советские времена называлась классической.

После окончания семи классов Новодворской школы Щучинского района уехал в Ростов-на-Дону, где поступил в строительное училище и начал заниматься сначала боксом, потом классической борьбой. Быстро росли спортивные результаты среди юношей, вошел в состав юношеской сборной Ростова, а потом и России, выполнил норматив мастера спорта СССР.

После вернулся домой и поступил в Минский институт физкультуры. Продолжал выступления на ковре, выиграл в молодежном чемпионате республики и стал призером взрослых соревнований.

Не смог реализоваться в спорте высших достижений из-за травм, которые получал одну за другой. Тогда все усилия и попытки я направил на развитие себя как педагога, преподавателя, тренера. На этой стезе успехи были более значимые. Я подготовил плеяду учеников и спортсменов, за свой труд получил звание «Заслуженный тренер БССР», а потом «Заслуженный тренер СССР».

Занимался научными исследованиями в области спорта, спорта высших достижений в особенности, защитил кандидатскую диссертацию, заслужил звание профессора. Не довел до завершения докторскую, потому что на те времена как раз пришелся спад интереса у государства и общественности к ученым званиям.

Тем не менее, с коллегами регулярно работаем с аналитическим материалом, трудимся над новыми методиками подготовки спортсменов высшей квалификации. Наши проекты используются студентами при подготовке к соревнованиям городского, областного и республиканского уровней, а методики внедрены и за границей. Я проводил семинары и работал со спортсменами в Польше, Хорватии, Чехии, Италии, Израиле и в других странах ближнего и дальнего зарубежья.

## СТУДЕНЧЕСТВО И АРМИЯ

Я учился в Белорусском государственном институте физической культуры, уже имея определенный опыт тренерской работы. Не успел окончить первый курс, как был призван в армию. Служил в спортивном батальоне Белорусского военного округа. И, естественно, выступал за сборные команды Белорусского военного округа и Республики Беларусь. После армии работал заместителем директора по физическому воспитанию и спорту Гродненского сельскохозяйственного техникума. А в 1970 году перешел в наш университет.

## БЫЛ СЛУЧАЙ...

В 70-м году, когда я начал работать в вузе, ректором был Дмитрий Спиридонович Марковский – замечательный педагог, чуткий и отзывчивый человек.

Вспоминаю случай того времени. Октябрь. Педагогический институт. Группа девушек. В малом спортивном зале мы расстелили ковер и в восемь часов вечера проводили занятия. В институте никого нет, одни мы тренируемся в такое позднее время. Заходит Дмитрий Спиридонович и спрашивает:

– А почему никого нет, только вы?

Отвечаю:

– Потому что у нас такое расписание: мы можем только вечером собраться и тренироваться со студентами.

На что Дмитрий Спиридонович замечает:

– Никого нет, одни вы работаете. А сколько вы получаете?

– 105 рублей как преподаватель кафедры.

– Зайдите завтра в девять утра ко мне в кабинет.

На следующий день я зашел к ректору, и он говорит:



– Пишите заявление. Мы вам присвоим «старшего преподавателя», чтобы больше зарабатывали.

Вот так, проработав два месяца в тогда еще педагогическом институте, я по распоряжению ректора был переведен на должность старшего преподавателя.



## О СТУДЕНТАХ

Со студентами у меня всегда гармоничные отношения. С удовольствием иду на лекции и практические занятия.

По-моему, молодежь всегда чувствует преподавателя и находит с ним взаимопонимание. От наставников должно идти желание поделиться с ними знаниями и опытом, своим видением.

Мое кредо – в каждом студенте видеть великого человека. К примеру, когда принимаю зачеты и экзамены, стараюсь дать понять каждому, что он великая личность, способная реализовать себя в любой области, которая ему по душе, где он способен раскрыть свои возможности. И не принципиально, что студент чего-то не знает: термин, формулу или научный закон. Если стремится реализовать себя и познать что-то новое, то он этого достигнет. Но здесь должно быть огромное желание, стремление и трудолюбие.

## 5 ВАЖНЫХ СОСТАВЛЯЮЩИХ В СПОРТИВНОМ УСПЕХЕ

Во-первых, у человека должна быть генетическая и физическая предрасположенность к тому виду спорта, в котором он может себя реализовать.

Во-вторых, для достижения высоких спортивных результатов необходимо здоровье. Потому что придется преодолевать супернагрузки, как физические, так и психологические.

В-третьих, целеустремленность.

В-четвертых, трудолюбие.

И, в-пятых, всегда рядом должен быть педагог, тренер.

Из всего перечисленного первую роль играет тренер. Только попав к нему, можно достигнуть успехов в спорте и в полной мере реализоваться как профессионалу.

**О нелегком спортивном и педагогическом пути профессора Максимовича узнавала Анастасия КАЛАЧ.**

**НА СНИМКАХ: тренер и его ученики.**

**Фото из домашнего архива Вячеслава Александровича Максимовича.**

# Сначала аз да буки, а потом науки



На кафедре общего и славянского языкознания стало доброй традицией отмечать День славянской письменности и культуры, который уже несколько лет проводится как университетский праздник. Неизменными кураторами мероприятия являются старшие преподаватели кафедры общего и славянского языкознания Елена Николаевна Мохань и Галина Чеславовна Мазько.

День славянской письменности и культуры – это, прежде всего, праздник во славу святых Кирилла и Мефодия, праздник славянской школы и науки. Не случайно он пришел в наши вузы и школы, где из поколения в поколение передаются знания и традиции, неразрывно связанные с отечественной историей, наукой, письменностью, литературой и искусством.

В рамках мероприятия прошло театрализованное представление, сопровождающееся красочной презентацией «Вначале было Слово…» и демонстрацией мультфильма, рассказывающего о возникновении славянской письменности. Гости праздника с удовольствием отгадывали загадки, вспоминали пословицы и поговорки, объясняли значение фразеологизмов. Таких как, например, «прописать ижицу», «стоять фертом», «знать на ять», «выписывать мыслете». Никого не оставила равнодушным инсценировка «Живая азбука». С особым интересом присутствующие слушали Людмилу Леонидовну Вдовенко, главного библиотекаря отдела искусств Гродненской областной научной библиотеки имени Е.Ф. Карского, которая познакомила с факсимильными изданиями памятников старославянской письменности. Студенты и школьники с волнением прикасались к листам Евангелия, с удовольствием рассматривали заставки на каждой странице в виде узора из листьев и цветов, разрисованные заглавные буквы, напоминающие дивных зверей, птиц и даже людей.

Ответную реакцию у всех гостей вызвали те факты, что на древнерусских книгах встречаются надписи с угрозой тому, кто решится на их похищение или своей небрежностью испортит ее. «А если поп или дьякон, прочитав, не застегнет всех застежек, – да будет он проклят».

Официальная часть праздника завершилась гимном Кириллу и Мефодию, создателям славянской азбуки, и награждением победителей олимпиад по старославянскому языку, славянской мифологии, а также творческого конкурса по латинскому языку.

Творческий концерт «Музыкальная мозаика», подготовленный студентами разных национальностей, вызвал бурю эмоций и аплодисментов и подтвердил тот факт, что в нашем университете учатся очень талантливые ребята.

В программе концерта прозвучали песни на разных языках. На латинском, греческом – в исполнении Дмитрия Долгополика, Марии Мерляк и Виктории Смолко; Мария Давыденко и Галина Высоцкая пели на русском; Моника Якимович, Кирилл Белятко – на белорусском, Анастасия Костюкович, Павел Павлович – на польском, Нигора Исанкулова – на узбекском языке.

Вся аудитория аплодировала Нафисе Давлетовой, исполнившей узбекский народный танец. Елена Антоневич и Сергей Канашевич поделились со слушателями самым сокровенным, прочитав стихи собственного сочинения.

Праздник завершился, но мы должны помнить, что всякий народ имеет право читать и писать на своем родном языке.

**Екатерина ШЕРШНЕВА, студентка 2 курса филологического факультета.**

ЖИТЬ ЗДОРОВО

# В ЗДОРОВОМ ТЕЛЕ – ЗДОРОВЫЙ... УМ

## Центр медицинской помощи и социального развития Гродненского государственного университета имени Янки Купалы отметил свое 20-летие



*(Окончание. Начало на 1-й стр.).*

Нынешние посетители университетского медцентра едва ли смогут представить те недавние времена, когда персонал и захворавшие студенты вынуждены были тесниться в маленьких темных кабинетиках в одном из вузовских общежитий. Теперь же он занимает целое крыло на первом этаже в корпусе университета по улице Горького, 95 и два оборудованных изолированных помещения в корпусе по улице Захарова, 32.

– Центр медицинской помощи и социального развития включает в себя кабинеты врачебного и доврачебного приема, кабинеты стоматологии со стерилизационной, массажа, функциональной диагностики, физиотерапевтический кабинет, а также изолятор и процедурную, – рассказывает о структурном подразделении его начальник, кандидат медицинских наук Оксана Викторовна Котова. – Безусловно, мы планируем расширяться. Так, в перспективе будет строиться еще одно университетское общежитие, проект которого предполагает наличие в нем современного, оснащенного по последнему слову техники медицинского комплекса.

К слову, в прошлом году к нашим медикам за помощью обратилось почти 50 тысяч человек. Из них, например, более 20 тысяч пришли на прием к терапевтам, около 2 тысяч записались к стоматологам. Стоит заметить, что велик спрос и на специалистов узкого профиля, которые оказывают консультативную помощь нуждающимся в ней студентам и сотрудникам. Так, 607 человек посетили врача-кардиолога, 835 – невролога. Около 3,5 тысяч ребят прошли плановый медосмотр.

Не подлежит сомнению тот факт, что справиться с таким потоком пациентов и оказать им квалифицированную медицинскую помощь может только настоящая команда, сплоченная общей гуманистической идеей – на страже здоровья универсантов стоит компетентный дружный коллектив, имеющий за плечами немалый опыт работы в различных медицинских учреждениях областного центра.

Раиса Леонтьевна Габрусевич, врач-терапевт I квалификационной категории, работает в центре с 2005 года, с тех пор, как он переехал в более просторные помещения на Горького. Поэтому о студентах ГрГУ, а точнее об их недугах, знает не понаслышке.

– В компетенции терапевта – прием и обслуживание больных студентов, медицинские осмотры, распределение в группы здоровья и группы для занятий физкультурой, выдача справок. Большое внимание уделяем диспансеризации: ведем систематическое наблюдение за состоянием здоровья нашей молодежи с целью предупреждения и раннего выявления заболеваний, своевременного их лечения и профилактики обострений. Ведь среди студентов есть ребята с врожденными сердечно-сосудистыми патологиями, сахарным диабетом и, увы, онкологическими заболеваниями. Это не может оставить медиков равнодушными. Согласно мировой практике, число хронических больных не должно превышать 20 процентов от общего количества студентов. К счастью, в нашем университете с этой задачей мы благополучно справляемся.



Кроме того, регулярно проводим лекции по пропаганде здорового образа жизни, правильного питания, профилактике простудных заболеваний. Часто в медицинском ликбезе нам помогают специалисты из учреждений здравоохранения города, например, центра СПИДа, кожно-венерологического диспансера.

Елена Васильевна Кизюкевич, медицинская сестра I категории, также без малого десять лет работает в центре. Поэтому со знанием дела посвящает в нюансы работы кабинета доврачебного приема:

– У нас хранится вся медицинская документация и полная картотека на всех обучающихся в ГрГУ имени Янки Купалы. А это – около 7,5 тысяч студентов дневной формы обучения. В нашей компетенции дежурства в корпусах университета во время централизованного тестирования, приема документов, проведение медосмотра не только первокурсников, но и студентов других курсов, в том числе с привлечением узких специалистов. Мы также подписываем допуски к практикам и работе, спортивным соревнованиям, походам, туристическим слетам. Кроме того, с целью профилактики заболеваний туберкулезом среди наших подопечных, выявления заболеваний на ранней стадии их развития, мы отслеживаем прохождение флюорографии. Сегодня можно с уверенностью сказать, что справились с этой задачей на 100 процентов.

В физиотерапевтическом кабинете пациенту также предложат широкий спектр лечения с помощью природных и физических факторов: тепла и холода, ультразвука, электрического тока, магнитного поля, различных видов излучения. Несомненное преимущество таких процедур в их высокой эффективности и безопасности: благодаря активному воздействию на организм, они повышают его естественные защитные функции, укрепляют иммунитет, здесь не требуется применение лекарственных препаратов. Как следствие – сроки лечения сокращаются, ускоряется заживление ран и воспалений, активизируются важнейшие биохимические процессы в организме, настраивая его на выздоровление. Кроме того, физиотерапия – прекрасное средство профилактики многих заболеваний. Впрочем о всех положительных сторонах этого лечения с удовольствием расскажет медсестра доврачебного кабинета Анна Иосифовна Серехан.



– Постепенно развивая физиотерапевтическое направление, мы будем закупать необходимое современное оборудование, – делится Оксана Викторовна. – В ближайших планах приобретение аппарата для профилактики и лечения хронической венозной недостаточности. Этим недугом часто страдают люди, долгое время находящиеся в положении стоя. К сожалению, к их числу принадлежат и работники университета, у которых длительное вертикальное положение в течение рабочего дня считается одним из факторов риска здоровья.

Есть в Центре медицинской помощи и социального развития абсолютно уникальные приобретения. Одно из них – современная кардиосистема, закупленная университетом в декабре 2013 года.

– Смертность от заболеваний сердечно-сосудистой системы сегодня на первом месте по распространенности в мире, артериальной гипертензией страдает каждый второй взрослый житель Беларуси, – поясняет врач-кардиолог по специальности Оксана Котова. – Не может не вызывать беспокойства и тот факт, что с каждым годом увеличивается число студентов, страдающих той или иной сердечной патологией. Для комплексного аппаратного электрокардиологического обследования и была приобретена новейшая система.

При помощи этого оборудования врач может проводить самые современные исследования и получить целый пакет информации о «делах сердечных», необходимый для точной диагностики и последующего лечения. Например, о сердечном ритме в состоянии покоя и нагрузки, артериальном давлении и ЭКГ. Возможным становится также выявление ишемии миокарда или артериальной гипертензии на ранних сроках. Важной составляющей кардиосистемы является велоэргометр или беговая дорожка.

Еще одна новинка в центре появилась буквально несколько недель назад. Это пока не имеющая аналогов в Гродно стоматологическая установка экспортного класса – одна из последних разработок словацких специалистов.

Главные достоинства – уникальный дизайн, предполагающий эргономию работы врача и максимальный комфорт пациента (хотя сочетаемость понятий комфорт и стоматология относительна! – *авт.*), электронное управление, автоматическая регулировка кресла, оснащенность апекслокатором и интероральной или внутриротовой камерой. Наличие последней, например, позволяет получить исчерпывающую информацию о состоянии полости рта, увидеть на экране цветное, увеличенное во много раз изображение любого зуба, оценить фактическое состояние полости рта. У врача же появилась возможность документировать результаты до и после установки пломб и коронок, визуализировать ошибки в лечении зубов, вносить фотографию пациента в электронную карту. Камера имеет собственный источник света, поэтому, в отличие от человеческого глаза, позволяет видеть абсолютно все, даже в самых труднодоступных местах.

Правда, если запломбировать зуб хочется с использованием самых передовых технологий и препаратов, за них придется заплатить. Безусловно, студенты и сотрудники могут претендовать на услуги терапевтической стоматологии на бесплатной основе: тогда им будет предложен низкозатратный рабочий материал.

К слову, с доведенным планом по оказанию платных услуг медцентр ГрГУ в прошлом году справился и даже выполнил его на 115 процентов.

Конечно, современная медицина достигла такого уровня, что может успешно бороться со многими заболеваниями. Но все же каждый из нас должен помнить, что любое заболевание легче предупредить, чем лечить. В стремлении к успеху, определенному социальному статусу, независимости мы не замечаем легких недомоганий, которые часто становятся теми самыми тревожными звоночками организма. Парадоксально, но на это попросту не остается времени. Поэтому медицинские работники обращаются к молодому поколению и их наставникам: умейте дорожить своим здоровьем – единственным бесценным достоянием. Это ведь так просто – жить здорово!

**Алеся ОЛЕШКЕВИЧ.**

**НА СНИМКАХ:** ***новейшая стоматологическая установка позволяет сделать лечение зубов максимально комфортным; медсестра терапевтического приема Елена КИРЧУК и врач-терапевт Раиса ГАБРУСЕВИЧ приводят в порядок медицинские карточки студентов; пройти медосмотр перед летним трудоустройством студентке 3 курса филфака Жанне КОПЕЙКИНОЙ помогает медсестра Елена КИЗЮКЕВИЧ; медсестра Анна СЕРЕХАН знает все о целебных свойствах светотерапии.***

**Фото автора.**



Заснавальнік:
УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1083 ад 21.01.2010.

Адрас рэдакцыі: вул. Ажэшкі, 22, пакой 208б, 230023, Гродна. Тэлефон 73-19-52.
Рэдактар: Іна Мікалаеўна ДАБРЫДЗЕНЬ.

Падпісана да друку: 14.07.2014 у 09.00.
Аб'ём – 2 друк. арк. Тыраж 1000 экз. Заказ № 4278.
Друк: ГАУПП «Гродзенская друкарня», г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4